

# Бібіла
# Юлія Іосіфаўна

(нар. 29 снежня 1896г. [10 студз. 1897 г.]) – беларускі савецкі бібліёграф, першая загадчыца аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (1921 – 1937 г.г.)

Юлія Іосіфаўна старанна збірала краязнаўчы і нацыянальны кніжны фонд, улічала паасобныя выданні на беларускай мове ў Расіі і за яе межамі ў 1835 – 1916 г. і кнігі, выдадзеныя ў БССР і за яе межамі ў 1917-1924 гадах. Распачала работу па бібліяграфічнай рэгістрацыі друку БССР („Летапіс беларускага друку") і складанні першай у рэспубліцы краязнаўчай бібліяграфічнай картатэкі.

У 60-70-х гадах прымала дзейсны ўдзел у складанні „Русской дореволюционной книги о Белоруссии. 1802 – 1916." (Мн., 1964), „Бібліяграфіі па гісторыі Беларусі." (Мн., 1969), „Асветы ў Беларускай ССР за 50 гадоў Савецкай улады" (Мн., 1972.)

Рашэннем пашыранага паседжання мясцкома ад 8 жніўня 1972 г. за доўгую і бездакорную працу ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна і ў азнаменаванне 50-годдзя з дня яе заснавання Ю.І. Бібіла занесена ў Кнігу Народнай Славы бібліятэкі.